Наш фармат

# ВЯЛІКІ КНІЖНЫ ПЕРАЕЗД

**Кніжкі створаны для таго, каб іх чыталі! Гэты факт відавочны і аспрэчваць яго не мае сэнсу. Калі працягваць лагічны ланцужок, то можна вывесці наступнае: кніжкі трэба недзе захоўваць. Менавіта для гэтага калісьці розум чалавечы прыдумаў бібліятэку.**

А яны, бібліятэкі, бываць розныя: маленькія ці вялікія, гарадскія ці вясковыя, утульныя ці не вельмі, новыя ці старыя. ЁСЦЬ у нашай сталіцы бібліятэка, якая дакладна адпавядае апошнім характарыстыкам. Нацыянальная. Сёння ў нас ёсць і старая, і новая Нацыянальная бібліятэка. Не ў сэнсе — дзве бібліятэкі як структурныя адзінкі, а два будынкі. Некаторыя кніжкі «жывуць» ужо ў новай бібліятэцы, а іншыя толькі рЫхтуюцца да пераезду.

Неяк наконт пераезду давялося пагутарыць з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Раманам Матульскім. Ён, дбайны гаспадар, мне расказваў пра тое, як кніжкі рыхтуюцца да пераезду: маўляў, нашы супрацоўнікі вельмі беражліва ставяцца да кожнай, упакоўваюць яе, каб ніякім чынам ніводны экзэмпляр «нацыянальнага багацця» не быў пашкоджаны. А дапамагаюць ім у гэтай адказнай справе студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

— Валанцёрскі атрад быў створаны па ініцыятыве нашага універсітэта, а таксама Беларускага рэспубліканскага оаюза моладзі і Нацыянальнай бібліятэкі, — расказвае студэнтка гэтай творчай ВНУ, актывістка, отаршыня «Штаба працоўных спраў» Кацярына Мароз. — Атрад называецца «Архіварыус». Стварылі мы яго для таго, каб дапамагаць Нацыянальнай бібліятэцы ў падрыхтоўцы да пераезду. і кансервацыі яе асноўных фондаў.

Заўважу, што першапачаткова для працаўладкавання бібліятэка папрасіла толькі 20 чалавек. А ва універсітэце добраахвотнікаў набралася на 5 чалавек больш — чым, канешне, у Нацыянальнай былі задаволены. Чым абумоўлена такое імкненне? Можа, рамантыкай — не ў кожнага сёння ёсць магчымасць трапіць у «святая святых» — кнігасховішча Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і ўласнымі рукамі «ўпакаваць» тую ці іншую кнігу, што існуе ў адзінкавым экземпляры...

— Я хачу адзначыць, — працягвае Кацярына Мароз, — што ўсе нашы студэнты на гэтай рабоце паказалі сябе проста выдатна, яны вельмі стараліся! А працаваць ў сховішчы было складана. Што ж, вялікі дзякуй усім за гэта!

**Зміцер КАРМАЗІН.**